БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 947.6"1902/1918" ' 329.1/.6(476)

ТОГУЛЕВА АЛЕНА ДЗМІТРЫЕЎНА

# БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ГРАМАДА: ПРАБЛЕМЫ ЎТВАРЭННЯ І ПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

07.0002 - Айчынная гісторыя

## А Ў Т А Р Э Ф Е Р А Т

ДЫСЕРТАЦЫІ НА САІСКАННЕ ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ КАНДЫДАТА ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК

Мінск 1996

Работа выканана на кафедры сусветнай і айчыннай гісторыі Белдзяржуніверсітэта

Навуковы кіраўнік - доктар гістарычных навук, прафесар У.К.Коршук

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук, прафесар М.С. Сташкевіч

кандыдат гістарычных навук, А.Ф. Мяснікаў

Апаніруючая арганізацыя - Беларуская дзяржаўная палітэхнічная акадэмія, кафедра гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры.

Абарона адбудзецца 25 сакавіка 1997 года ў 14 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220050, г.Мінск, пр. Ф.Скарыны, 4, гал. корп.)

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Белдзяржуніверсітэта (г.Мінск, пр.Ф.Скарыны, 4).

Аўтарэферат разасланы - лютага 1997 года

Вучоны сакратар Савета кандыдат гісарычных навук, дацэнт В.І. Сініца

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Актуальнасць тэмы дысертацыі. Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі, ліквідацыя манаполіі КПБ, развіццё дэмакратычных асноў дзяржаўнага ладу выклікала да жыцця шэраг палітычных партый. У кастрычніку 1994г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь "Аб палітычных партыях", у якім адзначалася, што "грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права на свабоду аб'яднання ў палітычныя партыі", якія ў сваю чаргу "дзейнічаюць на аснове прынцыпаў свабоды асацыяцыяў, дэмакратызму, самакіравання, законнасці, галоснасці і раўнапраўя усіх палітычных партый"[1].

Многія з нараджаючыхся сёння партый па назвах паўтараюць сваіх папярэднікаў, заяўляюць аб сваёй паслядоўнасці традыцыям беларускага нацыянальнага руху канца XIX - пачатку XX стагоддзяў. У гэтых умовах вельмі важна, каб палітычныя партыі, што дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі ў сучасны момант, узялі ад сваіх папярэднікаў усё самае лепшае, каб не паўтараліся былыя памылкі ў палітычных устаноўках, праграмах і тактыцы.

У сувязі з гэтым асабліваe значэнне і неабходнасць мае вывучэнне гісторыі першай беларускай нацыянальнай партыі - Беларускай Сацыялістычнай Грамады, з'яўленне якой на палітычнай арэне Беларусі было вынікам развіцця беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў к. XIX - пач. XX ст.

Усебаковае асэнсаванне працэса зараджэння і станаўлення першай беларускай нацыянальнай партыі, яе палітычная эвалюцыя пасля кастрычніка 1917г. дае магчымасць не толькі грунтоўна разабрацца ў мінулым Беларусі, але знайсці адказы на шматлікія пытанні, што ставіць сучаснае жыццё.

Звяртанне да гісторыі БСГ выклікана і неабходнасцю расказаць праўду аб тых, хто прымаў актыўны ўдзел у стварэнні Грамады, узначальваў яе ў цяжкія часы, адстойваў інтарэсы беларускай нацыі і адраджэнне яе культуры.

Мэта і задачы даследавання. Мэтай дадзенай дысертацыі з'яўляецца: даследаваць працэс узнікнення першай беларускай нацыянальнай партыі, дзейнасць БСГ у перыяд трох расійскіх рэвалюцый і палітычную эвалюцыю партыі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917г.

---

1. Закон Рэспублікі Беларусь "Аб палітычных партыях" //Праграмныя дакументы сучасных палітычных партый Беларусі. - Мінск: Белдзяржуніверсітэт, 1995.-С.5.

Аўтар ставіць перад сабой задачы:

1) Высветліць стан распрацаванасці і ступені даследавання праблемы ўзнікнення і дзейнасці БСГ у гістарычнай навуцы, адлюстраванне асноўных яе старонак у архіўных дакументах і публікацыях.

2) Паказаць працэс утварэння БСГ і яе дзейнасць напярэдадні першай расійскай рэвалюцыі (1903-1904 гг.).

3) Даць разгорнуты аналіз поглядаў і праграмных патрабаванняў БСГ у перыяд першай расійскай рэвалюцыі (студзень 1905-1907 гг.).

4) Даследаваць ролю БСГ у развіцці беларускага нацыянальнага руху пасля Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі: раскрыць асноўныя праграмныя палажэнні БСГ і разглядзець тактыку партыі ў перыяд з сакавіка па кастрычнік 1917 г.

5) Прааналізаваць дзейнасць БСГ па рэалізацыі ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці (Усебеларускі з'езд, утварэнне Народнага Сакратарыята Беларусі, абвяшчэнне БНР), ролю партыі ў гэтых падзеях.

6) Разглядзець прычыны распаду БСГ у 1918 г.

<u>Навуковая навізна і практычная значнасць даследавання.</u>

У дысертацыі ўпершыню ў абагульненым выглядзе асэнсоўваецца праблема ўзнікнення і дзейнасці Беларускай Сацыялістычнай Грамады, працэс яе палітычнай эвалюцыі і распад у 1918 г.

Даследчыкам уводзяцца ў навуковы абарот новыя архіўныя дакументы, раней закрытыя для вывучэння, абагульняюцца дакументы, гістарычныя крыніцы і літаратура, што тычацца дзейнасці БСГ.

Матэрыялы гэтай дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы спецыяльных і абагульняючых прац па гісторыі палітычных партый і грамадскіх рухаў, па паліталогіі і гісторыі Беларусі.

Даследаванне можа быць выкарыстана таксама пры выкладанні курсаў гісторыі і паліталогіі ў навучальных установах.

<u>Эканамічнае абгрунтаванне эфектыўнасці дысертацыйнай работы.</u> Дысертацыя мае камерцыйны інтарэс ва ўмовах выдання яе ў выглядзе манаграфіі.

Канкрэтны асабісты ўдзел аўтара ў атрыманні вынікаў і распрацоўцы палажэнняў, выкладзеных у дысертацыі. Дысертацыя з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем. Аўтарам праведзена значная праца па выяўленню і збору дакументаў, архіўных матэрыялаў, іх аналізу, сістэматызацыі і абагульненню. Непасрэднымі першакрыніцамі для дысертацыі з'яўляюцца праграмы БСГ; рэзалюцыі і пастановы з'ездаў і канферэнцый БСГ: агітацыйная літаратура Грамады; пратаколы і пастановы з'ездаў беларускіх арганізацый і партый у 1917г.; рэзалюцыі Беларускага Нацыянальнага Камітэта, Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый і партый, Вялікай Беларускай Рады; рэзалюцыі І-га Усебеларускага з'езда: дакументы Беларускай Народнай Рэспублікі.

Глыбокі аналіз архіўных крыніц, іншых дакументаў дазволіў аўтару раскрыць разнастайныя аспекты ўтварэння і дзейнасці першай беларускай нацыянальнай партыі - Беларускай Сацыялістычнай Грамады і зрабіць аргументаваныя вывады.

Апрабацыя вынікаў дысертацыі. Дысертацыйная праца была абмеркавана і атрымала станоўчыя водгукі на пасяджэнні кафедры сусветнай і айчыннай гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў публікацыях аўтара.

Структура і аб'ём дысертацыі. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы пяці раздзелаў, вывадаў, спіса выкарыстаных крыніц.

Змест дысертацыі займае 104 старонкі, спіс выкарыстаных крыніц складаецца з 244 найменаванняў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ.

Ва ўводзінах абгрунтоўваецца актуальнасць выбранай тэмы, яе храналагічныя рамкі, фармулююцца мэта і задачы даследавання. У раздзеле I "Гістарыяграфічны агляд" аўтар аналізуе выкарыстаныя пры напісанні дысертацыі навукова-літаратурныя і дакументальныя крыніцы.

Асноўныя гістарычныя працы, што маюць дачыненне да даследуемай праблемы, можна падзяліць на дзве галоўныя часткі:

1) Гісторыка-публіцыстычныя артыкулы, нарысы, нататкі, успаміны, напісаныя дзеячамі БСГ і іх сучаснікамі ў 20-30 гг.

2) Навукова-гістарычная літаратура, напісаная пасля XX-га з'езда КПСС навукоўцамі, прафесійнымі гісторыкамі і публіцыстамі.

1. Важнай першакрыніцай для даследавання гісторыі беларускай нацыянальнай партыі - Беларускай Сацыялістычнай Грамады з'яўляецца тая навукова-гістарычная спадчына, якая была створана ў 20-я гады сябрамі БСГ і іх сучаснікамі. Сярод іх трэба назваць імёны Я.Варонкі, А.Луцкевіча, Я.Канчара, Ф.Турука, У.Пічэты.[1] Публікацыі гэтых аўтараў змяшчаюць каштоўны матэрыял па агульным пытанням беларускага нацыянальна-вызваленчага руху на пачатку XX-га стагоддзя, а таксама па пытаннях аб узнікненні і дзейнасці БСГ. Так кніга Ф.Турука "Белорусское движение" побач з аўтарскім тэкстам мае дадатак у складзе 31 дакумента.

Першакрыніцай вестак аб БСГ з'яўляюцца публікацыі А.Бурбіса "Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху"[2] і "БСГ у першым перыядзе яе працы (1903-1907 гг.).[3] Гэтыя артыкулы змяшчаюць багаты фактычны матэрыял аб дзейнасці БСГ, а таксама асабістыя вывады аўтара, які быў актыўным дзеячом Грамады, членам яе ЦК.

У 1922-1928 гадах у гістарычным і грамадска-палітычным часопісе "Полымя" з'явіўся цыкл артыкулаў вядомага беларускага дзеяча З.Х.Жылуновіча. Яны былі прысвечаны гісторыі нацыянальнага руху, самавызначэнню беларускага народа.[4] Асаблівую каштоўнасць для

---

1. Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 года. - Коўна, 1920; Новіна А. /А.Луцкевіч). Палітычныя лозунгі беларускага руху// Зб.Наша Ніва. - Вільня, 1920; Канчер Е.С. Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов. Часть 2. История возникновения и деятельность организации. Выпуск 1//Неман. - 1933, № 1. - С. 138 - 164; Он же. Белорусский вопрос. Сборник статей. - Петроград, 1919; Турук Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов. - М., 1921; Пічэта У. Формы нацыянальнага й опозыцыйнага руху на Беларусі//Полымя. - 1924, № 2. - С. 142 - 146.
2. Стары Піліп /А.Бурбіс/. Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху//Вестник Народного Комиссариата просвещения БССР. - 1921, № 1. - С. 4-9, № 2. - С. 4-10.
3. Бурбіс А. БСГ у першым перыяде яе працы/1903-1907гг./ //Зб.Беларусь. - Мінск, 1924. - С. 177-182.
4. Жылуновіч З.Х. Беларуская інтэлігенцыя ў гістарычным аспекце// Полымя. - 1926, № 6. - С. 74-98; Ен жа. Два бакі беларускага руху//Полымя.- 1923, № 3 - 4. - С. 69-74; Ен жа. Алесь Бурбіс/ рэвалюцыйная характарыстыка/ //Полымя.- 1927, № 2. - С. 180-195.

вывучэння гісторыі БСГ маюць тыя гісторыка-публіцыстычныя артыкулы З.Жылуновіча, у якіх аўтар засяродзіў увагу на развіцці беларускага вызваленчага руху, яго сацыяльным і партыйным складзе, канчатковых мэтах, стратэгіі і тактыкі розных плыняў, груп, суполак, што ўваходзілі ў яго на этапе лютаўскай і кастрычніцкай рэвалюцый. З.Жылуновіч засяроджвае сваю ўвагу на працы БСГ, асабліва яе Петраградскай арганізацыі, лідэрам якой ён у той час з'яўляўся.[1]

Асобныя пытанні нацыянальна-вызваленчага руху і гісторыі БСГ былі закрануты ў зборніку "Беларусь", што выйшаў у свет у 1924г. у сувязі з пяцігоддзем абвяшчэння БССР.[2] Асаблівай увагі заслугоўваюць змешчаныя ў гэтым зборніку артыкулы З.Жылуновіча і Ў.Ігнатоўскага, якія непасрэдна тычацца дзейнасці БСГ.[3]

У 20-я гады ў свет выходзіць шэраг артыкулаў, якія змяшчаюць у сабе дакументальны матэрыял па гісторыі БСГ. З.Ангарэціс, М.Мялешка ў сваіх працах засяроджваюць увагу на агітацыйнай літаратуры БСГ часоў першай расійскай рэвалюцыі 1905-1907гг.[4] Асаблівую каштоўнасць у гэтым сэнсе маюць публікацыі А.Шлюбскага, які прадстаўляе нам праграму БСГ, што была прынята на ІІ-м з'ездзе ў 1906 гаду, а таксама цікавыя матэрыялы адносна існавання першых беларускіх легальных газет "Наша Доля" і "Наша Ніва".[5]

---

1 Уступамі да Акцябра //Полымя.- 1923, № 5-6. - С. 141-149, № 7-8. - С. 86-91; Ад Кастрычніка 1917 да Лютага 1918.//Полымя.- 1924, № 1. - С. 153-167; Арганізацыя сіл. /Да гісторыі Савецкай Беларусі/ //Полымя.- 1924, № 2. - С. 163-179; Гістарычны момант //Полымя. - 1924, № 4. - С. 144-158; З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25 сакавіка 1917г. //Полымя.- 1925, № 6. - С. 202-206; Беларускія секцыі РКП і стварэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі//Полымя.- 1928,№ 10. - С. 73-79.

2 Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і вызваленчага руху. - Мінск, 1924.

3 Жылуновіч З. Люты - Кастрычнік у беларускім нацыянальным руху // Зб. Беларусь. - С. 182-195; Ігнатоўскі Ў. Вялікі Кастрычнік на Беларусі //Зб. Беларусь - С. 196-215.

4 Ангарэтис З. Белорусская Социалистическая Громада //Вперед. -1923, № 2-3. -С.64-67; Мялешка М. Барацьба БСГ за зямлю ў 1905г. //Полымя. - 1926, № 1.-С.152-159.

5 Шлюбскі А. Канфіскацыя першага беларускага часопіса "Наша Доля" // Савецкая Беларусь.-1923, №153; Ен жа. Да гісторыі канфіскацыі "Нашай Нівы" // Полымя.-1925,№4.-С.185-189; Ен жа. Да гісторыі БСГ //Полымя.-1925,№5.-С.157-163.

Складаную тэму дзейнасці дробна-буржуазных партый на Беларусі ў тым ліку і БСГ разглядаюць у сваіх публікацыях С.Агурскі, Л..Каган, А.Кіржніц, С.Пінталь.[1] У сваіх працах яны прыходзяць да агульнаї высновы, што БСГ была "дробна-буржуазнай нацыяналістычнай партыяй, якая ставіла нацыянальнае вызваленне Беларусі вышэй за ўсе".[2]

Шэраг цікавых думак аб характары і асаблівасцях нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі, аб стварэнні і дзейнасці першай беларускай нацыянальнай партыі выказаў адзін з арганізатараў і кіраўнікоў БСГ А.Луцкевіч у сваіх успамінах аб працы першых беларускіх арганізацый "За дваццаць пяць гадоў".[3]

Такім чынам, літаратура, напісаная ў 20-я гады, якая тычыцца дзейнасці БСГ, мае важнае значэнне для сучасных даследчыкаў. Напісаныя гэтыя публікацыі відавочнікамі і непасрэднымі ўдзельнікамі колішніх падзей. Менавіта гэта дазваляе даследчыкам супаставіць розныя меркаванні, погляды і ацэнкі ў адносінах да БСГ.

У першае паслярэвалюцыйнае дзесяцігоддзе даволі мірна суіснавалі розныя школы і накірункі даследаванняў, што спрыяла рознабаковаму вывучэнню мінулага Беларусі. Аднак актыўнае ўмяшанне партыйных структур і ўрада паступова прывялі да ўсталявання адной метадалогіі - марксісцкай. У выніку гэтага гістарычныя працы 30-х гадоў характарызуюцца прамалінейнасцю, схематызмам, якія былі абумоўлены слабым веданнем тэорыі і фактаў гісторыі. Дзейнасць БСГ разглядалася

1 Агурскі С. Роля дробна-буржуазных партый на Беларусі ў Кастрычніцкай рэвалюцыі //Бальшавік Беларусі. -1927, №5-6. -С.69-74, 45-50; Он же. Очерки по истории революционного движения в Белоруссии /1863-1917гг./. -Мінск, 1928; Кіржніц А. У няволі буржуазнага нацыяналізму //Бальшавік Беларусі. -1928, №1-3.-С.50-62; Каган Л.Люты-Кастрычнік на Беларусі //Полымя. -1925. №7. -С.82-96; Пинталь С. Остатки контрреволюционных партий в Белоруссии //Вперед. -1923, №1/5/. -С.50-53.

2 Агурскі С. Роля дробна-буружазных партый на Беларусі ў Кастрычніцкай рэвалюцыі. -С.46.

3 Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў /1903-1918гг./. -Вільня: Беларускае выдавецкае Таварыства, 1928.

толькі як дзейнасць нацыяналістычнай контррэвалюцыйнай арганізацыі.[1]

2. Пасля XX-га з'езда КПСС з'явіліся гістарычныя працы, публікацыі, зборнікі дакументаў аб нацыянальным і рэвалюцыйным руху на Беларусі і ўдзеле ў ім БСГ,[2] у якіх узмацніўся акцэнт на навуковым вывучэнні гэтых праблем.

Найбольш грунтоўна ў гэты час роля беларускіх нацыянальных арганізацый у тым ліку і БСГ у станаўленні беларускай дзяржаўнасці прадстаўлена ў публікацыях і манаграфіях даследчыка-юрыста В.А.Круталевіча[3].

У 60-80 гг. з'яўляюцца публікацыі, у якіх разглядаюцца пытанні дзейнасці і ролі нацыянальных палітычных партый, што дзейнічалі на

---

1 Гл.: Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: Зборнік успамінаў і артыкулаў. -Мінск, 1934; Зюзькоў А. Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі. -Мінск, 1931; Ен жа. Бальшавікі - арганізатары Кастрычніка ў Беларусі. -Мінск, 1934; Сталевіч А. Аб вытоках беларускага нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-фашызму //Бальшавік Беларусі. -1929, №10-12. -С.17-76; Шчарбакоў В.К. Класавая барацьба і гістарычная навука ў Беларусі. -Мінск, 1934.

2 Александровіч С.Х. З гісторыі выдання беларускіх газет "Дзянніца" і "Светач" //Веснік БДУ.Сер.4.-1969,№3; Документы и материалы по истории Белоруссии.- Минск. АН БССР, 1953.-т.3 /1900-1917гг./; Камінскі М.І. Усебеларускі стараста //Маладосць.-1967,№3; Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии.- Минск,1962; Якутов В.Д. А.Г.Червяков: Страницы биографии.- Минск,1978.

3 Круталевич В.А. Правдиво освещать историю создания белорусской государственности //Коммунист Белоруссии.-1993.№6; Ен жа. Без народнай апоры //Полымя.-1967.№2; Он же. Становление национальной государственности белорусского народа //Советское государство и право.- 1967.№12; Ен жа. Абвяшчэнне рэспублікі //Полымя.-1968.№9; Он же. Провал контрреволюционных планов создания Белорусского буржуазного государства и образование БССР \окт.1917 февр.1918 гг.\.- Минск,1973; Он же. Рождение Белорусской Советской Республики /на пути к провозглашению республики. Октябрь 1917 - декабрь 1918 гг./ .- Минск,1975.

тэрыторыі Беларусі на пачатку XX-га стагоддзя.[1]

Значны ўклад у распрацоўку тэмы гісторыі партый і рухаў, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі на пачатку XX-га стагоддзя, і асабліва гісторыі БСГ унес даследчык М.С.Сташкевіч.[2]

Публікацыі гэтага аўтара адрозніваюцца шырокім выкарыстаннем раней малавядомых архіўных дакументаў. У сваіх даследаваннях М.С. Сташкевіч дае характарыстыку стратэгіі і тактыкі БСГ і іншых палітычных партый, звяртае ўвагу на іх нацыянальныя праграмы. У яго працах раскрываюцца асноўныя рысы і асаблівасці нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі ў 1917-1918 гг.

Значны ўклад у распрацоўку тэмы беларускага нацыянальнага адраджэння ўнес гісторык М.В.Біч, які ў сваіх працах паказаў вытокі барацьбы беларускага народа за нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне.[3]

---

1 Малашка А.М. К вопросу об оформлении однопартийной системы СССР.- Минск,1969; Савчук Е.Ф. Из истории борьбы большевиков против буржуазного национализма в период оккупации Белоруссии в 1918 г. // В кн. Вопросы истории БССР.- Минск, 1969; Заспнец В.П.Борьба большевиков Белоруссии против мелкобуржуазных партий /Октябрь 1917 - январь 1919 гг./ : Автореферат дис. ... канд. ист. наук. - Минск, 1973; Липецкий Э.А. Борьба большевистских организаций Белоруссии с мелкобуржуазными партиями в период подготовки и проведения Великой Октябрьской социалистической революции / март 1917 - янв. 1918 гг./ : Автореферат дис. ... канд. ист. наук: /Белгосуниверситет. - Минск,1973; Солошенко В.И. Большевики в борьбе с мелкобуржуазными партиями в Белоруссии.- Минск,1981.

2 Сташкевич Н.С. Общественное движение в Белоруссии: основные идейные течения и политические партии: Автореферат дис. ... докт. ист. наук: - Минск,1990; Ен жа. Непазбежнае банкрутства: з гісторыі палітычнага краху нацыяналістычных партый у Беларусі 1917-1925гг.- Мінск, 1974; Он же. На пути к истине: Из истории национально-освободительного движения в Белоруссии. 1917 год. - Минск, 1983; Он же. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии: 1917-1925 гг. - Минск, 1985;

3 Біч М.В. У змаганні за лепшую долю //Полымя.-1966, №8; Ен жа. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыята Беларусі ў канцы XIX- пачатку XXст.//Весці АН БССР. Сер.грам.навук.-1972, №4; Ен жа. К.Каліноўскі як рэвалюцыйны дэмакрат//Весці АН БССР.Сер.грам.навук.-1988, №1; Ен жа. У якіх межах былі абвешчаны БНР і БССР?//Наша слова.-1994, 25 мая; Ен жа. Рудовіч С.С. Беларуская Сацыялістычная Грамада// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6т. -т.1. - Мінск, 1993. -С.410-412.

У другой палове 80-х г.-першай палове 90-х г. адной з найбольш актуальных тэм даследаванняў застаецца гісторыя грамадска-палітычных рухаў і партый.[1]

Значным укладам у распрацоўку гэтай тэмы з'явілася манаграфія І.М.Ігнаценкі "Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии"[2], у якой на аснове дакументальных крыніц, выяўленых у апошні час, асвятляецца працэс утварэння беларускай дзяржаўнасці і роля ў ім беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, у тым ліку і БСГ.

У сучаснай гістарычнай навуцы значнае месца займаюць даследаванні, што датыкаюцца біяграфій тых людзей, якія актыўна ўплывалі на ход гістарычнага працэсу і рабілі ўсе магчымае, каб беларускі народ меў сваю нацыянальную свядомасць і сваю дзяржаву.[3]

Праблемы гісторыі беларускага этнасу, фарміравання беларускай нацыі, барацьбы беларускага народа за нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне, лёсу беларускіх нацыянальных партый і гісторыі БСГ знаходзяцца ў сферы навуковых інтарэсаў гісторыкаў і юрыстаў В.Кругалевіча, Я.Юхо, М.Сташкевіча, С.Рудовіча, А.Каўкі, М.Біча, А.Сідарэвіча і інш.[4]

---

1 Октябрь 1917г. и судьбы политической оппозиции. Совместное российско-белорусское исследование. В трех частях.-Гомель. 1993: Палітычныя партыі Беларусі: Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. -Мінск.1994.

2 Игнатенко И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии.-Минск,1992.

3 Давідовіч А. Грамадска-палітычная дзейнасць З.Х.Жылуновіча /1905-1937гг./: Дыс. ...канд.гіст.навук.-Мінск,1995; Мяснікаў А. Нацдэмы: Лес і трагедыя Фабіяна Шантыра, Усевалада Ігнатоўскага і Язэпа Лёсіка.-Мінск,1993; Сидоревич А. Антон Луцкевич:Гл. Из книги //Неман.-1990,№7; Крывіцкі Л. Нельга абыйсці маўчаннем//Спадчына.-1994, №1; Туронак Ю. В.Іваноўскі і адраджэнне Беларусі//Маладосць.-1994, №8,9.

4 Круталевич В.А. На путях самоопределения: БНР - БССР - РБ.-Минск,1995; Сташкевич Н.С.Белорусская Социалистическая Громада//Коммунист Белоруссии.-1991.№6; Юхо Язэп. Беларускія ўрады 1918-1921гг. і іх паўнамоцтвы//Беларускі гістарычны часопіс.-1993,№3; Рудовіч С.С. Белорусское национальное движение в период февральской буржуазно-демократической и Великой Октябрьской социалистической революций: Дис. ...канд.ист.наук.-Минск, 1987; Багдановіч А.Г.Праблема нацыянальнай дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным руху Беларусі /сакавік 1917 - студзень 1919гг./:Дыс. ...канд.гіст.навук.-Мінск,1995: Каўка А. Беларускі вызваленчы рух. Спроба агляду//Спадчына.-1991,№5; Біч Міхась. Дзяржаўнасць Беларусі: станаўленне, барацьба за аднаўленне// Беларуская мінуўшчына.-1993,№5-6; Сідарэвіч А. Дакументы Беларускай Сацыялістычнай Грамады часоў рэвалюцыі 1905г.//Спадчына.-1991.№3.

Першакрыніцай вестак па гісторыі БСГ з'яўляюцца апублікаваныя ў 1995г. "Собственноручные показания А.И.Луцкевича. 30 октября 1939г."[1] Нягледзяцы на ўмовы, у якіх А.Луцкевіч паведамляе аб сваім удзеле ў беларускім нацыянальным руху, ён адзначае цікавыя факты з гісторыі БСГ, яе ўтварэння і дзейнасці, дае асабістую ацэнку тым ці іншым падзеям як непасрэдны ўдзельнік.

Шырока асвятляецца нацыянальна-вызваленчая барацьба беларускага народа ў шматтомнай працы - "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі"[2] і ў першай частцы "Нарысаў гісторыі Беларусі", што былі выданы Інстытутам гісторыі АН Беларусі.[3]

Такім чынам, тэма беларускага нацыянальнага адраджэння і дзейнасці першай беларускай нацыянальнай партыі была і застаецца адной з найбольш актуальных у беларускай гістарыяграфіі, сведчанне чаму шматлікасць навуковых працаў асабліва ў апошні перыяд. Прынцыповыя пытанні ўзнікнення БСГ, яе дзейнасці, узаемаадносін з іншымі палітычнымі партыямі, а таксама яе роля ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху патрабуюць далейшага даследавання, пераадолення неабгрунтаваных меркаванняў і сцвярджэнняў.

Прапануемая работа напісана на грунце разнастайных дакументальных крыніц.

Перш за ўсе, былі выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь - ф.62, воп.1 /Архіў БНР/, ф.60, воп.3 /Дакументы сабраныя інстытутам гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КПБ/.

У Беларускім дзяржаўным архіве знаходзяцца матэрыялы, якія тычацца арганізацыі і дзейнасці Беларускага нацыянальнага камісарыята і Беларускіх камуністычных секцый /ф.4,воп.1/; Народнага Сакратарыята БНР /ф.325,воп.1/. Цікавасць для даследавання ўяўляюць асабістыя фонды БДА: фонд К.Езавітава /ф.458, воп.1/ і Я.Канчара /ф.311, воп.1/.

Матэрыялы па гісторыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху змяшчае ф.3, воп.1 Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і

1 Собственноручные показания А.И.Луцкевича. 30 октября 1939г.//Неман.-1995.№5.

2 Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.У 6 т. Т.1,2,3.-Мінск,1993,1994,1996.

3 Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х част./АН Беларусі. Інст-т гіст.-Мінск,1994. Част.1.

мастацтва /Калекцыя дакументаў аддзела рукапісаў Беларускага музея Івана Луцкевіча ў г.Вільна/. У справах гэтага фонду можна знайсці дакументы, што тычацца арганізацыі і дзейнасці БСГ, Віленскай Беларускай Рады, БСДРП і іншых беларускіх партый і арганізацый, а таксама асобных нацыянальных дзеячоў - А. і І.Луцкевічаў, А.Бурбіса, А.Смоліча, З.Жылуновіча, Я.Дыла і інш.

Каштоўнай крыніцай сталі публікацыі перыядычнага друку даследуемага перыяда. Цікавы і разнастайны матэрыял змяшчаюць газеты - "Наша Доля", "Наша Ніва", "Вольная Беларусь", "Беларуская зямля", "Беларуская Рада", "Гоман", "Дзянніца" і інш. Публікацыі беларускага перыядычнага друку дапамаглі ўзнавіць шматлікія падзеі, якія не знайшлі адлюстраванне ў архіўных дакументах.

У раздзеле II "Прадпасылкі і ўтварэнне першай беларускай нацыянальнай партыі - Беларускай Сацыялістычнай Грамады" аўтар разглядае ўмовы развіцця нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі на працягу XIX-га ст., паказвае працэс утварэння БСГ і яе дзейнасць напярэдадні першай расійскай рэвалюцыі.

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух бярэ свой пачатак з сярэдзіны XIX-га стагоддзя, з моманту паўстання 1863г. пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага. Да гэтага часу рост рэвалюцыйнай самасвядомасці беларусаў выяўляецца, галоўным чынам, у межах польскага рэвалюцыйнага руху. І толькі К.Каліноўскі адным з першых разглядае беларускае пытанне не як частку польскага, а як пытанне зусім самастойнае, ён імкнецца прабудзіць сялянскія масы дзеля барацьбы за палітычнае вызваленне Беларусі і Літвы і ўтварэнне самастойнай Літоўска-Беларускай Рэспублікі.

Лозунгі будавання беларускай дзяржаўнасці ў федэратыўнай сувязі з Расіяй прапагандавалі беларускія народнікі ў публікацыях 80-х г. Іх адозвы заяўлялі аб існаванні самастойнага беларускага этнасу, аб законным праве беларусаў займаць роўнае месца сярод славянскіх народаў, заклікалі моладзь да аб'яднання ў самастойную дэмакратычную арганізацыю "Беларуская Грамада", якая павінна была разгарнуць барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа.

Гэтыя ідэі беларускіх народнікаў аказалі значны ўплыў на дзейнасць беларускіх студэнцкіх гурткоў, якія існавалі ў 90-я гг. у Маскве, Петраградзе і іншых гарадах Расіі. Але дзейнасць гэтых гурткоў не выходзіла за межы студэнцкага жыцця і была вельмі кароткай.

У 1901-1902 навучальным годзе на грунце вучнеўскай арганізацыі "Гурток беларускай народнай асветы і культуры" была ўтворана Беларуская рэвалюцыйная партыя, якая не была партыяй у поўным сэнсе гэтага слова. Яна была толькі канцэпцыяй самастойнага руху і вывела на парадак дня задачы нацыянальнага адраджэння.

У 1903 г. на грунце БРП была ўтворана першая беларуская нацыянальная партыя - Беларуская рэвалюцыйная грамада. Па свайму сацыяльнаму складу БРГ была аб'яднаннем розных пластоў беларускага этнасу, сярод іх пераважалі выхадцы з апалячанай шляхты, заможных пластоў сялянства, інтэлігенцыі, чыноўніцтва.

У снежні 1903 г. у Вільні адбыўся першы з'езд БРГ. Партыя выступіла з патрабаваннем тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі з сеймам у Вільні і даравання шырокай нацыянальна-культурнай аўтаноміі для ўсіх нацыянальных меншасцей, што жывуць на тэрыторыі Беларусі; адначасна зазначала неабходнасць хутчэйшай распрацоўцы зямельнай праграмы на падставе бязвыкупнай канфіскацыі прыватна-уласніцкіх і дзяржаўных зямель.

У канцы 1904-пачатку 1905г. Беларуская рэвалюцыйная грамада была перайменавана ў Беларускую Сацыялістычную Грамаду.

Агітацыйная дзейнасць БРГ на працягу 1903-1904гг. дала некаторыя вынікі, але значнага ўплыву яна не мела. Адозвы і нацыянальныя патрабаванні Грамады не знаходзілі моцнай падтрымкі сярод беларускага сялянства і "працавітай беднаты" - наогул. Гэта тлумачылася тымі спецыфічнымі асаблівасцямі, якія мела Беларусь у адрозненні ад іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі: блізкасць да рускага народа па мове, культуры, побыту, гісторыі; рэлігійная варожасць паміж каталікамі і праваслаўнымі; шматнацыянальны склад насельніцтва; панаванне ўласнікаў не беларусаў у асноўных сферах эканомікі /яўрэйскай буржуазіі ў прамысловасці і гандлю, польскіх і рускіх памешчыкаў у землеўладанні/.

<u>У раздзеле III "Дзейнасць БСГ у перыяд першай расійскай рэвалюцыі 1905-1907 гг. і ва ўмовах надыходу рэакцыі"</u> аўтар даследуе тактыку Грамады ў перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг., дае разгорнуты аналіз поглядаў і праграмных патрабаванняў БСГ.

Рэвалюцыя 1905-1907 гг. садзейнічала ўздыму нацыянальных рухаў прыгнечаных народаў Расійскай імперыі, у тым ліку і беларускага. Мэтай апошняга было вызваленне ад рускага дзяржаўнага цэнтралізму і панскага эканамічнага ўціску, а таксама адраджэнне афіцыйна непрызнанай беларускай нацыянальнай культуры. Беларуская Сацыялістычная Грамада -

як першая нацыянальная партыя беларускага народа, змагалася за ажыццяўленне гэтай мэты.

Дзейнасць БСГ у студзені - сакавіку 1905г. выявілася ў скліканні сялянскага з'езда ў Мінску, распаўсюджванні пракламацый "Царская гаспадарка", брашуры "Да свайго бога" і лістовак "Што такое канстытуцыя?", "Настаў час!" і "Царова жніво". У гэтай агітацыйнай літаратуры Грамада патрабавала свабоды слова, адмены цэнзуры, свабоды сходаў, таварыстваў і саюзаў, агульнай адукацыі за дзяржаўны кошт, роўнасці рэлігій і народнасцей, народнага выбарнага суда і недатыкальнасці асобы.

Летам 1905г. БСГ утварыла ў Мінску І Краёвы камітэт, а ў Вільні ІІ Краёвы камітэт і выдала цэлы шэраг адкрытых лістоў, адозваў і пракламацый на беларускай мове, у якіх заклікала сялян да барацьбы з царскім урадам за зямлю і волю. Асабліва пашырылася выдавецкая справа БСГ пасля заснавання ў канцы 1905 г. уласнай падпольнай друкарні ў Мінску.

Па няпоўных звестках нелегальныя выданні БСГ у час першай расійскай рэвалюцыі распаўсюджваліся ў Мінску, Вільні, Дзісне, Рэчыцы, Мінскім, Ігуменскім, Барысаўскім, Бабруйскім, Наваградскім, Слуцкім паветах Мінскай губерніі, Віленскім, Гродзенскім, Берасцейскім і Бельскім паветах Гродзенскай губерніі. Прапагандыская дзейнасць Грамады амаль не закранула ўсход Беларусі. Так, у Магілеўскай губерніі зусім не зафіксавана фактаў распаўсюджвання яе лістовак. На тэрыторыі Віцебскй губерніі такія факты зафіксаваны толькі ў Віцебскім павеце.

У студзені 1906 г. у Мінску адбыўся ІІ з'езд БСГ, на якім разглядаліся наступныя пытанні: праграма і тактыка партыі, арганізацыныя пытанні, выбары ЦК.

У праграме партыі бліжэйшай сваей задачай БСГ абвясціла звяржэнне самадзяржаўя /сумесна з пралетарыятам усей Расіі/ і выказалася за ўтварэнне Расійскай Федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі са свабодным самавызначэннем і культурна-нацыянальнай аўтаноміяй усіх народнасцей дзяржавы. Для Беларусі Грамада патрабавала дзяржаўнай аўтаноміі з мясцовым сеймам у Вільні. Падкрэслівалася, што вярхоўная ўлада павінна належаць заканадаўчаму сходу, які спалучае яе з самым шырокім мясцовым самакіраваннем.

У аграрным пытанні БСГ на ІІ з'езде адмовілася ад эсэраўскай ідэі сацыялізацыі зямлі і адобрыла тэзіс аб утварэнні абласнога зямельнага

фонду з казенных, удзельных, царкоўных і памешчыцкіх уладанняў, які больш адпавядаў патрабаванню аўтаноміі Беларусі.

З'езд распрацаваў Статут партыі і выбраў ЦК, у склад якога ўвайшлі А.Луцкевіч, І.Луцкевіч, В.Іваноўскі, А.Бурбіс.

У чэрвені 1906 г. адбылася канферэнцыя БСГ, якая вырашыла энергічна працягваць байкот Дзяржаўнай Думы і адначасова падтрымліваць рэвалюцыйныя патрабаванні асобных думцаў, якія не супярэчылі праграме БСГ.

У канцы 1906 - пачатку 1907 г. ва ўмовах відавочнага спаду рэвалюцыі цэнтрам беларускага рэвалюцыйнага і культурнага руху стала Вільня. Тут разгарнулася выдавецкая справа БСГ: у верасні 1906 г. пачала выходзіць першая легальная беларуская газета "Наша Доля" - орган Грамады. Аднак з чатырох нумароў яе тры былі канфіскаваны. Пасля выхаду шостага нумара газета была закрыта.

Мясцовыя арганізацыі левых партый ва ўмовах панавання контррэвалюцыі і рэакцыі летам і восенню 1907 г. былі амаль усюды разгромлены, або аслаблены. БСГ згарнула свае падпольныя структуры і як партыя часова перастала існаваць.

Кіраўнікі БСГ засяродзіліся на легальнай дзейнасці ў газеце "Наша Ніва", якая была арыентавана на культурна-прасветніцкую працу, займалася праблемамі эканомікі краю, не дакранаючыся палітыкі.

У раздзеле IV "Адраджэнне БСГ пасля Лютаўскай рэвалюцыі і яе дзейнасць да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г." аўтар паказвае ролю БСГ у развіцці беларускага нацыянальнага руху пасля Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, раскрывае асноўныя праграмныя палажэнні БСГ і разглядае тактыку партыі ў перыяд з сакавіка па кастрычнік 1917 г.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. падарвала асновы вялізарнай Расійскай імперыі і стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця ў краіне дэмакратычных асноў і адраджэння нацыянальных рухаў прыгнечаных народаў Расіі. Беларусы, як і астатнія народы Расійскай імперыі, атрымалі надзею дабіцца калі ня поўнай незалежнасці, то ва ўсякім разе аўтаноміі. БСГ, якая аднавіла сваю дзейнасць адразу ж пасля Лютаўскай рэвалюцыі стала на чале адраджаючагася беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

25 сакавіка 1917 г. у Мінску адбылася арганізацыйная канферэнцыя БСГ, якая выказалася за працяг вайны і прыняла рэзалюцыю аб

падтрымцы Часовага ўрада. БСГ прэтэндавала на ролю выразніка інтарэсаў беларускага сялянства, але ў той жа час выступала супраць захопу сялянамі памешчыцкіх земляў, прапаноўвала чакаць, пакуль зямельнае пытанне вырашыць "краёвы сейм аўтаномнай Беларусі". Грамада заклікала актыўна рыхтавацца да Усерасійскага ўстаноўчага сходу, праводзіла агітацыю за Расійскую федэратыўную рэспубліку і аўтаномію Беларусі ў ёй. Канферэнцыя выбрала Мінскае бюро, якое павінна было весці ўсю арганізацыйную працу, у тым ліку і падрыхтоўку да з'езда партыі. ·

Улетку 1917 г. БСГ карысталася найбольшай папулярнасцю ў масах сярод усіх існуючых беларускіх партый і арганізацый. Да гэтага часу яна колькасна вырасла, значна пашырыла свой уплыў на дробнабуржуазную інтэлігенцыю, частку сялянства, асабліва заможных пластоў, чыноўнікаў, салдат. У яе арганізацыі ўваходзілі і рабочыя. Арганізацыі БСГ актыўна дзейнічалі ў Мінску, Петраградзе, Маскве, Віцебску, Бабруйску і іншых гарадах, а таксама ў многіх павятовых цэнтрах Беларусі, у часцях Заходняга фронту. Восенню БСГ аб'ядноўвала ў сваіх радах каля 10 тыс. чалавек. Аб прыналежнасці да БСГ заявіла Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая група, якая дзейнічала ў Вільні.

Пад уплывам рэвалюцыйных падзей у краіне ў БСГ адбываецца працэс класавай дыферэнцыяцыі. Гэта выявілася ўжо на Петраградскай канферэнцыі Грамады 4-6 чэрвеня 1917 г., затым вылілася ў адкрытыя непаразуменні паміж кіраўніцтвам Маскоўскай і Петраградскай арганізацый БСГ, а больш глыбокія разнагалоссі вызначыліся на другім з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый 8-12 ліпеня 1917 г. і на першай сесіі Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый 5-6 жніўня 1917 г.

Петраградская арганізацыя БСГ, якая абапіралася на рабочых-беларусаў петраградскіх заводаў і матросаў Балтыйскага флоту, выступіла за далейшае развіццё класавай барацьбы супраць ідэі " агульнанацыянальнасці" за змяненне тактыкі партыі і распрацоўку новай праграмы БСГ з улікам развіцця рэвалюцыйных падзей. Пазіцыю Петраградскай арганізацыі падтрымалі Віцебская і Бабруйская арганізацыі БСГ.

Для вырашэння партыйных супярэчнасцей у кастрычніку 1917 г. быў скліканы III партыйны з'езд БСГ. Нягледзячы на тое, што на гэтым з'ездзе была прынята новая Праграма БСГ, у якой партыя выступіла за аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэспублікі, за перадачу зямлі ва ўсенароднае карыстанне, за абвяшчэнне дэмакратычных свабод, сумясціць супрацьлеглыя групы ў БСГ, якія адстойвалі эвалюцыйны і рэвалюцыйны шляхі развіцця, не ўдалося.

Левая плынь, якая аб'ядноўвала Петраградскую, частку Маскоўскай і Бабруйскай арганізацый, хаця арганізацыйна і не парвала з партыяй, аднак не падпарадкавалася ЦК. Яе кіруючым цэнтрам стаў Петраградскі камітэт БСГ.

На працягу ўсяго часу, пачынаючы з сакавіка 1917 г., БСГ прымала актыўны ўдзел у стварэнні і дзейнасці беларускіх нацыянальных органаў / Беларускім Нацыянальным Камітэце, Цэнтральнай Радзе беларускіх арганізацый, Вялікай Беларускай Радзе і інш./ і аказала значны ўплыў на развіццё беларускага нацыянальнага руху.

У раздзеле V " БСГ пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі" аўтар аналізуе дзейнасць БСГ па рэалізацыі ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці, разглядае ролю партыі ў падрыхтоўцы і правядзенні Усебеларускага з'езда, у стварэнні Народнага Сакратарыята Беларусі, у абвяшчэнні Беларускай Народнай Рэспублікі, вызначае прычыны распаду БСГ вясной 1918 г.

Лозунг свабоднага самавызначэння народаў аж да дзяржаўнага аддзялення, які быў абвешчаны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі, паставіў усе беларускія арганізацыі перад пытаннем афармлення нацыянальнага і дзяржаўнага самавызначэння Беларусі.

БСГ прыняла непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні I Усебеларускага з'езда, які адбыўся ў Мінску ў снежні 1917 г. З-за ўзнікшых разнагалоссяў на з'ездзе не была створана фракцыя БСГ.

Значная частка членаў Грамады разам з прадстаўнікамі Вялікай Беларускай Рады ўваходзіла ў склад Аб'яднанай сацыялістычнай фракцыі і выступала за абвяшчэнне Беларускай народнай рэспублікі; арганізацыю часовай народнай улады на Беларусі ў форме рады, якая ў кароткі час павінна склікаць Устаноўчы сход; неадкладную перадачу ўсей зямлі без выкупа ў народнае карыстанне; стварэнне беларускага войска.

Другая частка прадстаўнікоў БСГ, дзеячоў рэвалюцыйнага крыла, утварыла сваю фракцыю, якая адабрала існуючую Савецкую ўладу на Беларусі, прызнавала Воблвыкамзах , аднак падтрымлівала ідэю арганізацыі " беларускіх саветаў".

Усебеларускі з'езд стаў на грунт стварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы і вызначыў форму гэтай дзяржаўнасці - народная рэспубліка. Ён пастанавіў стварыць орган улады - Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Але Савет не стаў кіруючым органам, бо сам Усебеларускі з'езд быў разагнаны загадам Абласнога выканаўчага камітэту Заходняй вобласці і фронту.

З лютага 1918 г., з моманту акупацыі большай часткі Беларусі Германіяй, дзейнасць БСГ развівалася па двух напрамках. Першы ахапіў тыя арганізацыі БСГ, якія знаходзіліся на тэрыторыі Савецкай Расіі / Петраградская , Маскоўская /. Яны адмежаваліся ад лініі ЦК, які застаўся ў Мінску, перайшлі на платформу Савецкай улады, выступілі за стварэнне беларускай дзяржавы на савецкай аснове, выказалі непрымірымую барацьбу мінскай Беларускай Радзе і адмовіліся ад агульнага членства ў БСГ з тымі, хто падтрымліваў Раду.

Другі напрамак аб'яднаў Мінскую і Віленскую арганізацыі БСГ, якія дзейнічалі згодна з пастановамі I Усебеларускага з'езда і ва ўмовах акупацыі выступілі з ініцыятывай фарміравання ўрада ў выглядзе Народнага Сакратарыята Беларусі, а затым прынялі актыўны ўдзел у абвяшчэнні Беларускай Народнай Рэспублікі і яе незалежнасці.

У выніку абвастрэння супярэчнасцей па пытаннях аб адносінах да германскіх акупантаў, аб беларускай дзяржаўнасці, аб зямлі БСГ да лета 1918 г. распалася на Беларускую партыю сацыялістаў- рэвалюцыянераў, Беларускую партыю сацыялістаў- федэралістаў і Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю.

Выхадцы з левага крыла партыі ўдзельнічалі ў рабоце Беларускага нацыянальнага Камісарыята, некаторыя з іх уступілі ў беларускія секцыі РКП/б/. У студзені 1919 г. З.Жылуновіч, А.Чарвякоў, Я.Дыла, Ф.Шантыр увайшлі ў склад першага ўрада БССР.

У апошняй частцы дысертацыі - " Высновы" - аўтар падводзіць вынікі даследавання, робіць неабходныя абагульненні.

Навуковыя палажэнні, што выносяцца на абарону.

1. У 1902 г. Беларуская рэвалюцыйная партыя, якая нарадзілася з беларускіх студэнцкіх гурткоў, заклала асновы для стварэння ў 1903 г. Беларускай рэвалюцыйнай грамады, якая ў хуткім часе стала Беларускай Сацыялістычнай Грамадой. БСГ у першым перыядзе яе працы да рэвалюцыі 1905 г. была тыповым вузкім рэвалюцыйным гуртком, які не меў цесных сувязей ні з рабочым класам, ні з сялянствам Беларусі.

2. У час першай расійскай рэвалюцыі 1905-1907 гг. БСГ, якая колькасна ўзрасла і значна пашырыла сваю дзейнасць, выступала як рэвалюцыйна-дэмакратычная арганізацыя леванародніцкага напрамку. Знішчэнне самадзяржаўя, устанаўленне федэратыўнай буржуазна-дэмакратычнай рэспублікі са свабодным самавызначэннем народаў, абласная аўтаномія для Беларусі - платформа БСГ у рэвалюцыі 1905 г.

3. БСГ пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. узначаліла беларускі нацыянальны рух, прыняла актыўны ўдзел у арганізацыі і працы беларускіх нацыянальных органаў / Беларускім Нацыянальным Камітэце, Цэнтральнай Радзе беларускіх арганізацый і партый. Вялікай Беларускай Радзе і інш./. БСГ выступіла за аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэспублікі, за перадачу зямлі ва ўсенароднае карыстанне, за абвяшчэнне дэмакратычных свабод.

4. БСГ пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. непасрэдна ўдзельнічала ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці. Дзейнасць партыі развівалася па двух напрамках. Першы ахапіў арганізацыі БСГ, якія знаходзіліся на тэрыторыі Савецкай Расіі /Петраградская, Маскоўская/. Яны перайшлі на платформу Савецкай улады і выступілі за стварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Другі напрамак аб'ядноўваў Мінскую і Віленскую арганізацыі БСГ,якія дзейнічалі згодна з пастановамі I-га Усебеларускага з'езда і ва ўмовах нямецкай акупацыі выступілі з ініцыятывай фарміравання ўрада ў выглядзе Народнага Сакратарыята Беларусі, а затым прынялі актыўны ўдзел у абвяшчэнні БНР і яе незалежнасці.

5. Знешнія абставіны і ўнутраныя супярэчнасці па пытаннях аб адносінах да германскіх акупантаў, аб беларускай дзяржаўнасці і аб зямлі прывялі да расколу БСГ і ліквідацыі яе як адзінай партыі.

<u>Асноўныя палажэнні даследавання выкладзены ў публікацыях аўтара:</u>


1. Беларуская Сацыялістычная Грамада ў 1917-1918 гг. // Веснік БДУ. Серыя 3.- 1995,№1.-С. 7-10.

2. Беларуская Сацыялістычная Грамада ў перыяд першай рускай рэвалюцыі 1905-1907 гг. // Веснік БДУ. Серыя 3.-1995,№3.-С.68-71.

3. Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады // Гуманітарна-эканамічны Веснік.- 1996,№2.-С.37-41.

# Р Э З Ю М Э

Тогулева Алена Дзмітрыеўна

## БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ГРАМАДА: ПРАБЛЕМЫ ЎТВАРЭННЯ І ПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ.

Беларусь. нацыя. нацыянальнае самавызначэнне. дзяржаўнасць. аўтаномія, федэрацыя, нацыянальна-вызваленчы рух. незалежнасць. палітычная партыя. партыйная праграма. партыйны статут, палітычныя правы. рэвалюцыя. Усебеларускі з'езд, Беларуская Народная Рэспубліка.

У дысертацыі аўтар даследуе працэс узнікнення і дзейнасці першай беларускай нацыянальнай партыі - Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

Работа грунтуецца на аб'ектыўным аналізе шырокага кола разнастайных і малавядомых дакументальных крыніц. а таксама на выкарыстанні дасягненняў айчыннай гістарыяграфіі.

Навуковая навізна даследавання заключаецца ў тым. што аўтар упершыню ў беларускай гістарыяграфіі прадпрымае спробу ў абагульненым выглядзе асэнсаваць праблему ўзнікнення і дзейнасці Беларускай Сацыялістычнай Грамады, працэс яе палітычнай эвалюцыі і распад у 1918 г.

У рабоце даецца разгорнуты аналіз поглядаў і праграмных патрабаванняў БСГ у перыяд трох расійскіх рэвалюцый. аналізуецца, дзейнасць Грамады па рэалізацыі ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці / Усебеларускі з'езд, утварэнне Народнага Сакратарыята Беларусі. абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі/.

Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы спецыяльных і абагульняючых працаў па гісторыі палітычных партый і грамадскіх рухаў, па паліталогіі, гісторыі Беларусі, а таксама пры выкладанні курсаў гісторыі і паліталогіі ў навучальных установах.

## Р Е З Ю М Е

Тогулева Елена Дмитриевна

## БЕЛОРУССКАЯ СОЦИАЛИСТИЧЕСКАЯ ГРОМАДА: ПРОБЛЕМЫ ОБРАЗОВАНИЯ И ПОЛИТИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ.

Беларусь, нация, национальное самоопределение, государственность, автономия, федерация, национально-освободительное движение, независимость, политическая партия, партийная программа, партийный устав, политические права, революция, Всебелорусский съезд, Белорусская Народная Республика.

В диссертации автор исследует процесс возникновения и деятельности первой белорусской национальной партии - Белорусской Социалистической Громады.

Работа основывается на объективном анализе широкого круга разнообразных и малоизвестных документальных источников, а также на использовании достижений отечественной историографии.

Научная новизна исследования заключается в том, что автор впервые в белорусской историографии предпринимает попытку в обобществленном виде осмыслить проблему возникновения и деятельности Белорусской социалистической громады, процесс ее политической эволюции и распад в 1918 г.

В работе дается развернутый анализ взглядов и программных документов в период трех российских революций, анализируется деятельность Громады по реализации идеи национальной государственности ( , Всебелорусский съезд, создание Народного Секретариата Белоруссии, провозглашение Белорусской Народной Республики).

Материалы диссертации могут быть использованы при подготовке специальных и обобщающих трудов по истории политических партий и общественных движений, по политологии, истории Беларуси, а также при преподавании курсов истории и политологии в учебных заведениях.

## SUMMARY

Toguleva Elena Dmitrievna

BELORUSSIAN SOCIALIST GROMADA: THE PROBLEMS OF THE FORMATION AND POLITICAL ACTIVITY.


Belarus, nation, national self-determination, statehood, autonomy, federation, national liberation movement,indepedence, political party, party programme, party rules, political rights, revolution, All-Belorussian congress, Belorussian People's Republic.

In the theses the author studies the process of the formation and activity of the first belorussian national party - Belorussian Socialist Gromada.

The research is based on the unbiassed analysis of the wide range of various little known documentary sources and also usage of the achievments of the Belorussian historiography.

The scientific novelty of the research is in the author's attempts to comprehend the problem of the formation and activity of the BSG, of the process of political evolution of the BSG and disintegration of the party in 1918.

The reseach contains the broad analysis of the views and programme documents of the BSG in the period of 3 Russian revolutions; it analysis the BSG activity in revolutions of the idea of national statehood (All Belorussian congress; formation of the Belorussian National Secretariat; proclamation of the Belorussian Peoples Republic).

The thesis materials may be used to prepare special and generalizing works on the history of political parties and public movements, on political science, on Belorussian history. The thesis material may also be used for conducting, courses on history and political science in educational establishments.